*У студэнцкіх творчых калектывах*

# УВЕСЬ ЧАС У ПОШУКУ

1986 год — адметны ў жыцці нашай краіны. Гэта год XXVII з'езда КПСС. Надзвычай плённым стаў ён для літаратурнага клуба «Градыент» народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ. Шмат цікавых спраў на ліку градыентаўцаў. Паэтычны вечар «Назаўсёды абавязаўшы: быць» (па лірыцы А. Блока), беларускія вячоркі «У зямлі нашы карані», літаратурна-музычны спектакль «Добры дзень, Імрэ Кальман!» знаёмы многім студэнтам нашага універсітэта, гасцям Клуба інтэрнацыянальнай дружбы ГДУ, вучням школ г. Гомеля. Партыйным форумам краіны і нашай рэспублікі прысвячалася таксама выязное пасяджэнне клуба ў Веткаўскім музеі народнай творчасці «Гэта спадчына нам засталася ад прадзедаў», вечар сучаснай савецкай літаратуры «Быць грамадзянінам».

Больш глыбокай і дзейснай становіцца сувязь клуба «Градыент» з працоўнай моладдзю Гомеля. Так, на вечар сучаснай савецкай літаратуры студэнты запрасілі рабочых фабрыкі «Палесдрук», работнікаў Веткаўскага музея, гомельскага аэрапорта. Яны разам з градыентаўцамі абмяркоўвалі аповесці В. Быкава «Знак бяды», В. Распуціна — «Пажар», паэму Я. Еўтушэнкі «Фуку». Высветлілася, што праблемы нацыянальнага беларускага характару, духоўных імкненняў сучаснага чалавека, грамадзянскай актыўнасці пісьменніка аднолькава хвалююць і студэнцкую, і працоўную моладзь.

Ужо другі раз члены літаратурнага клуба прынялі ўдзел ва Усесаюзным адзіным клубным дні, які ў гэтым годзе праводзіўся па тэме «Партыя — розум, гонар, сумленне нашай эпохі». Ганаровымі гасцямі «Градыента» былі студэнтка завочнага факультэта ГДУ, дэлегат XXVII з'езда КПСС Н. В. Рыбак, ветэран Вялікай Айчыннай вайны З. Е. Цімафеева, інструктар Цэнтральнага райкома партыі С. Д. Бадруноў, прадстаўнікі абласнога і гарадскога таварыстваў кнігалюбаў. Да Усесаюзнага адзінага клубнага дня градыентаўцы падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю «Партыя — розум, гонар, сумленне нашай эпохі» па творах паэта-трыбуна рэвалюцыі У. Маякоўскага. Патрыятычныя, баявыя вершы У. Маякоўскага чыталі студэнты матфака В. Шведаў, І. Дрэмук, Л. Сініла, А. Гаўрылавец. Усімі ўдзельнікамі кампазіцыі выконваліся песні савецкіх кампазітараў аб партыі, аб Радзіме, аб юнацтве. У адзіным, натхнёным гучанні вершаў, песень адчувалася вялікая еднасць моладзі, гатоўнасць да здзяйснення велічных планаў партыі, Радзімы. І гэта зразумела, бо клуб «Градыент» з'яўляецца ініцыятарам шматлікіх добрых пачынанняў на факультэце. Сярод удзельнікаў клуба — два члены КПСС і тры кандыдаты ў члены партыі.

Цікавай, памятнай была размова градыентаў з Надзеяй Васільеўнай Рыбак, якая падзялілася ўражаннямі аб рабоце XXVII з'езда КПСС, аб пачуццях, выкліканых дакладам Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачовым.

Аб рабоце Цэнтральнага райкома партыі г. Гомеля, ролі камуністаў ў выкананні рашэнняў з'езда расказаў студэнтам С. Д. Бадруноў.

Заключнае слова было прадстаўлена рэктару народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання дацэнту Т. П. Гаранінай. Яе ўразіла выступленне градыентаўцаў, «шчырае, ад сэрца ідучае».

Жаданне вучыцца і працаваць па-ленінску, самаадданa, даносіць да людзей свае веды, здабыткі — такія характэрныя рысы членаў літаратурнага клуба «Градыент».

**Н. КАПШАЙ,**
**загадчыца сектара ідэйна-выхаваўчай работы бібліятэкі ГДУ.**



НА ЗДЫМКУ: студэнтка гр. Ф-44 фізічнага факультэта Вольга Давыдзенка за ЭВМ «Электроніка ДЗ-28» выконвае разліковае заданне да лабараторнай работы па курсу «Антэны звышвысокіх частот».

Фота Н. Кір'янавай.

*НОВЫЯ АБРАДЫ*

# РАСЦІ ШЧАСЛІВЫМ, ЧАЛАВЕК!



З'явіўся новы чалавек... Новы савецкі грамадзянін. Якім ён будзе? Кім стане? Можа гэтыя пакуль што маленькія ручкі, што цягнуцца да маці, праз некаторы час павядуць міжпланетны карабель да зор, будуць будаваць гарады, чараваць людзей дзівоснай музыкай. Гэта ўсё будзе. А пакуль шчаслівыя маці і бацька радасна ўсміхаюцца свайму першынцу, сімвалу свайго шчырага кахання. Але з'яўленне новага чалавека — гэта не толькі радасць для блізкіх і родных дзіцяці, гэта знамянальны факт для грамадства і дзяржавы. Не выпадкова ўсе стагоддзі сямейным абрадам удзялялася вялікая ўвага.

Наш імклівы час — гэта эпоха вялікіх здзяйсненняў, радасных змен, грандыёзных перспектыў. Менавіта імі абумоўлена з'яўленне ўсё новых пачынаў, ініцыятыў як у сферы эканомікі, так і ў сферы духоўных адносін. Яно характарызуецца шырокім распаўсюджаннем такой важнай з'явы духоўнага жыцця, як сучасныя грамадскія і грамадзянскія абрады і традыцыі.

У Праграме КПСС запісана: «Падтрымліваючы прагрэсіўныя традыцыі кожнага народа, робячы іх здабыткам усіх савецкіх людзей, партыя будзе ўсямерна развіваць новыя, адзіныя для ўсіх нацый рэвалюцыйныя традыцыі будаўнікоў камунізма». Гэтыя задачы добра ўсведамляе і калектыў аддзела ЗАГС Савецкага раёна г. Гомеля. Сведчаннем таму — нядаўна праведзенае ў Палацы культуры хімзавода свята ўрачыстага прысваення імя новаму жыхару горада.

Раздзяліць шчасце маладой сям'і Фраловых прыйшлі супрацоўнікі аддзела ЗАГС, Палаца культуры, блізкія і родныя, сябры па рабоце і вучобе. Дзень прысваення імя стаў радасным не толькі для гэтай сям'і, але і для ўсіх прысутных. Бо тут гучалі пажаданні ў вялікі жыццёвы шлях маленькаму Сяргею, гаварыліся палымяныя словы аб маці, Радзіме, партыі, аб шчаслівым прызначэнні чалавека ў сацыялістычным грамадстве.

Шчаслівых бацькоў віншавалі сябры па рабоце і вучобе (Васіль Фралоў працуе на заводзе «Гідрааўтаматыка», Ірына — студэнтка экамфака ГДУ). Вялікую дапамогу ў правядзенні свята аказала рэктар народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, в. а. загадчыцы кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму дацэнт Т. П. Гараніна. Самыя шчырыя, ласкавыя словы знайшла яна для вінаўнікаў урачыстасці, уручыла ім ад прафкома студэнтаў ГДУ падарунак. Ад імя раённага Савета народных дэпутатаў горача і пранікнёна гаварыла сакратар райвыканкома Т. С. Філімончык. Водар духмяных кветак надаваў святу яшчэ большую ўрачыстасць.

Свята прысваення імя толькі пачынае свае першыя крокі. Наперадзе — вялікая работа па распрацоўцы цікавага сцэнарыя, вывучэнне лепшых нацыянальных традыцый. Тут ёсць простор для думкі і фантазіі.

**С. ШТЭЙНЕР,**
**загадчыца аддзела ЗАГС Савецкага раёна г. Гомеля.**

**НА ЗДЫМКУ:** хвалюючы і ўрачысты момант у сямейным жыцці маладых бацькоў Ірыны і Васіля Фраловых.

*СЛОВА — ВУЧОНАМУ*

# ЗАХАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ НА ЗЯМЛІ

Калі і дзе ўзнікла жыццё на нашай планеце? Адказ на гэта пытанне вучоныя шукаюць у пластах горных парод з акамянелымі ў іх раслінамі і жывёламі, якія некалі раслі і жылі на Зямлі. Аднак першыя старонкі каменнага летапісу падобны на абломкі гліняных таблічак з вавілонскім клінапісным тэкстам — патрабуецца шмат працы, каб спасцігнуць іх сэнс. Нядзіўна, што і ў нашы дні геолагі і біёлагі не могуць даць канчатковага адказу на пастаўленае пытанне.

Шматлікія рэшткі жывёл і раслін, якія сустракаюцца ў каменным вуглі, сланцах, вапняках і іншых горных пародах, сведчаць аб існаванні жыцця ў далёкім мінулым. На аснове гэтых выкапняў рэштках арганізмаў і было зроблена заключэнне, што жыццё на Зямлі з'явілася каля 570 мільёнаў гадоў назад. Яшчэ зусім нядаўна такія ўяўленні сярод геолагаў былі звычайнымі.

Аднак з ростам навуковых ведаў межы існавання жыцця на Зямлі бесперапынна адсоўваюцца ў самыя глыбінныя пласты геалагічнай гісторыі. Так, напрыклад, ва ўзорах горных парод, паднятых пры бурэнні Кольскай свідравіны з глыбінь 8—10 км, былі знойдзены значныя ўключэнні акамянелых мікраарганізмаў, якія жылі два мільярды гадоў таму назад. Нагадаем, што свідравіна на Кольскім паўвостраве самая глыбокая ў свеце. Праходка яе звыш 12 км — вялікі поспех савецкіх вучоных, металургаў і інжынераў.

Самыя старажытныя пласты горных парод ва ўзросце 3—3,5 мільярдаў гадоў знойдзены геолагамі ў Афрыцы, Канадзе, ва Усходняй Сібіры на Алдане. Ва ўсіх іх захаваліся рэшткі бактэрый і водарасцей. Строга навуковыя факты аб выключнай старажытнасці Зямлі і жыцця на ёй нанеслі сакрушальны ўдар па рэлігійных догмах, біблейскіх выдумках аб стварэнні свету прыдуманым Богам.

А ўсё ж такі колькі часу прайшло з моманту нараджэння Зямлі, як касмічнага цела да нашых дзён? 4—4,5 мільярды гадоў — такая ацэнка ўзросту зямнога шару сучаснай навукай. Але ніхто да гэтага часу не даказаў, што больш стражытнае — Зямля ці жыццё. Гэта думка ўпершыню па-прарочы была выказана геніяльным геахімікам В. І. Вярнадскім і нядаўна на старонках газеты «Известия» была зноў паўторана кіраўніком савецкіх палеантолагаў акадэмікам Б. С. Сакаловым.

Жывёльны свет за мільярды гадоў прайшоў складаны шлях. Гэта было ўзыходзячае біялагічна прагрэсіўнае развіццё — ад прасцейшых аднаклетачных бактэрый да чалавека. Але вось што здзіўляе, прымушае пакланіцца перад магутнасцю Прыроды: геалагічнай навукай бясспрэчна даказана, што з'явіўшыся, жыццё ўжо ніколі ў цэлым не знікала, якія б катастрофы, звязаныя з рэзкім змяненнем клімату, не абрушваліся на планету: грандыёзныя вулканічныя вывяржэнні, вялікія абледзяненні або дапускаемыя ў мінулым сустрэчы з касмічнымі прышэльцамі-каметамі і буйнымі метэарытамі.

Але ці заўсёды будзе так? Пачуццё трывогі, няхай нават падсвядома, не пакідае мяне нават у самыя шчаслівыя моманты жыцця. Няўжо ўсё жывое на Зямлі, у тым ліку чалавецтва, прайшло такую вельмі доўгую і мудрую эвалюцыю толькі дзеля таго, каб у лічаныя мінуты загінуць у ядзерным смерчы?! Немагчыма зразумець, ацаніць усю глыбіню маральнага падзення (іншыя словы мне цяжка падабраць) амерыканскага імперыялізму, які выношвае злавесныя планы зоркавых войнаў, ядзерных пажараў, здольных перарваць або зусім скалечыць вялікі жыццёвы ланцуг. Хочацца верыць, што Розум пераможа!

**В. ВАХРУШАЎ,**
**загадчык кафедры мінералогіі і агульнай геалогіі, прафесар.**

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

# ПАКЛАНІЦЕСЯ ДУБУ

(Працяг. Пачатак у № 19).

У НЕКАТОРЫХ мастацкіх творах, якія адлюстроўваюць часы сівой мінуўшчыны нашай краіны, сустракаецца апісанне вянчання маладых людзей ля свяшчэнных дубоў. Так, у рамане Івана Мяло «Прынада», ёсць адпаведныя радкі: «Век пакланяйся яму (пану — А. Н.), усё роўна па-добраму за цябе Алеську не аддасць. Чым так сядзець — звёў бы ў лес. Абвянчайцесе вакол дуба. Багі вас благаслаўляць».

Часта дрэвы, якім пакланяліся, нават «кармілі» (перад тым, як трэба было секчы лес), спадзяючыся такім шляхам задобрыць «лясных духаў». Працэс «кармлення» дрэва, якое павінна стаць часткай нейкай будыніны, «размову» з ім, можна знайсці ў этнаграфічных працах А. Е. Багдановіча.

У апошні час вучоныя сцвярджаюць яшчэ і такі факт: першым хлебам старажытнага чалавека быў хлеб жалудовы. Нашы далёкія продкі «спрабавалі на зуб» усё, што давала прырода, і, безумоўна, ацанілі спажыўнасць жалудоў. Можна ўявіць, як жалуды вымочвалі, сушылі, падсмажвалі на агні, і паступова справа дайшла да выпякання хлеба. Так, пры раскопках паселішчаў пяцігадовай даўнасці (Украіна) археолагі знайшлі печ з адбіткамі жалудоў у гліне. У цяжкія ваенныя і першыя пасляваенныя гады жыхары разбураных раёнаў Беларусі дамешвалі ў жытнёвую муку патоўчаныя жалуды.

Дуб з незапамятных часоў лічыўся ў народзе сімвалам мудрасці, развагі, сілы і нават розуму. Дж. Фрэзер, напрыклад, падкрэслівае, што ў фальклорах розных народаў некаторыя дрэвы, у тым ліку і дуб, маюць адбітак сталасці, памяркоўнасці. Сюды, канешне, не ўваходзяць травы і нізкарослыя прадстаўнікі лесу. Але даволі часта можна пачуць і зняважлівае «Эх, ты дубіна!», што наадварот, падкрэслівае тупасць, самаўпэўненасць некаторых людзей, іх цвердалобасць.

Калі закрануць тое дрэва, якое ў народзе лічыцца свяшчэнным, то той, хто гэта зрабіў, будзе абавязкова пакараны. А. Е. Багдановіч прыводзіць такі прыклад: «Беларусы б. Ігуменскага павета раней верылі, што ёсць такія дрэвы, якія нельга секчы: як не сцеражыся, а яно цябе прыдушыць. У раёне Барысава быў некалі ссечаны дуб, які самотна стаяў на паляне, «старажытны дуб» вельмі вялікіх памераў. Калі яго ссеклі, то падаючы, ён раздушыў усіх, хто яго сек, і, акрамя таго, цэлы тыдзень пасля гэтага лютавала страшэнная бура з громам і маланкамі, якая прынесла многа гора. А раней, калі дуб стаяў, то з кожным, хто яго секане сякерай, абавязкова здаралася няшчасце. Не раілі таксама беларусы секчы дрэва, якое скрыпіць, бо гэта пэўная прыкмета, што ў дрэве мучыцца чалавечая душа: чалавек, які ссек такое дрэва, прымушае яе шукаць сабе новы прытулак, за што ён можа паплаціцца калецтвам, а калі і сваім жыццём».

НЕКАТОРЫЯ археалагічныя, фальклорныя крыніцы пераканаўча сведчаць пра тое, што ў старажытных славян культ дуба быў звязаны з культам звяроў. Вельмі цікавы прыклад прыведзены ў зборніку «Новае ў археалогіі Кіева» (1983). Гаворка ідзе аб больш чым дзевяцімятровым ствале дуба, які быў вымыты земснарадам у Дняпры, паблізу вусця Дзясны. На вышыні 6 м у яго закладзены дзевяць дзічыных сківіц з клыкамі. Няма сумнення, што перад намі свяшчэннае дрэва, культ якога ў старажытных славян быў цесна звязаны з культам звяроў. У свой час (1910 г.) падобная знаходка была выцягнута з дна Дзясны паміж Острам і Чарнігавам. К. Балсуноўскі справядліва бачыў у ёй свяшчэнны дуб Перуна, падобны да таго, які, па словах К. Багранараднага, рос на Хорціце (Запарожская сеч) і ля якога русы прыносілі ахвяры язычніцкім багам.

Знойдзены ў 1975 г., дуб стаяў на месцы перасячэння шляхоў з Кіева на Чарнігаў. Як і хорціцкі, ён таксама іграў ролю своеасаблівага свяцілішча, дзе адбываліся розныя язычніцкія гульні, ахвярапрынашэнні. Вакол Кіева такіх свяшчэнных дубоў было, відаць, многа. Звесткі пра іх захаваў і летапіс.

Свет у цэлым ўяўляўся старажытнаму чалавеку адушаўленым, і дрэвы, вядома, не складалі выключэння. «Бывае,—адзначае вядомы французскі даследчык фальклору Б. Оля, — што ўшанаванне аддаецца і жывому дрэву той ці іншай пароды, так як лічылася, што ў ім схавалася звышнатуральная сіла». Наш прашчур верыў у тое, што дрэвы валодаюць душамі, такімі ж як у людзей, і свядома пакланяўся ім. Дрэвам надаваліся розныя цудадзейныя ўласцівасці, асабліва тым, у якія ўдарыла маланка. У народзе існавала павер'е, што дуб (магло быць і іншае вялікае, моцнае дрэва) з'яўляецца сімвалам дрэва-хмары. Зіма выпівае з яго сок і ён замірае, а вясною, з абуджэннем прыроды ажывае і пачынае цвісці маланкамі. Адсюль і выслоў'е «Цвіце перуновым цветам». У беларускім фальклоры можна знайсці шмат прыкладаў, дзе маланка б'е менавіта ў верхавіны магутных дубоў: «але ось і пачаў Пярун палыскаць: трэсне ў хвоюдак і расколе ад самага верху аж да карэня, трэсне ў дуба — расколе дуба, як цёўку» (казка «Каваль-багатыр»). Ствараецца ўражанне, што маланка быццам бы незнарок толькі і рабіла, што шукала ў лесе дуб, каб ударыць у яго. З другога боку можна лёгка растлумачыць, чаму менавіта ў гэтае дрэва біла «страла» Перуна. Дубы заўсёды любяць расці як бы асобна ад іншых дрэў, на невялічкіх палянах, да таго ж яны ўзвышаюцца над ляснымі абшарамі, таму і трапляла ў іх маланка часцей за ўсё. Гэтай звычайнай з'яве старажытны чалавек, які не мог яе растлумачыць, надаваў магічнае значэнне.

СВОЕАСАБЛІВЫ страх перад лесам адлюстраваны ў многіх вуснапаэтычных творах. Калі мы звернемся да беларускага фальклору, то ўбачым, што адносіны да лесу ў селяніна былі дваякімі. У адных выпадках — лес хаваў людзей ад эксплуататараў, заступаўся за іх. Там жылі, паводле народных паданняў, легендарныя казачныя героі Рымша і Машэка, а з другога боку, лес — вораг мужыка-земляроба. Менавіта адтуль выходзілі на дарогу бязлітасныя рабаўнікі—разбойнікі, якія не шкадавалі ні старога, ні малога, наводзілі жах на жыхара вёскі. У непралазнай ляснoй глушы зрабілі сваё сховішча таксама нячыстыя і чэрці, ведзьмакі і Кашчэі Бессмяротныя і іншыя адмоўныя персанажы вуснапаэтычных твораў.

Што тычыцца непасрэдна вобраза самога дуба, то ён выступае напрыклад, у песеннай лірыцы, як памяркоўны бацька, старэйшы брат, якія заступаюцца за сваіх малодшых, за сваю сям'ю. Вельмі часта вобраз гэтага дрэва асацыіруецца з вобразам маладога хлапца, жаніха, казака:

**— Ты, дубочак зеляненькі...**
**Шырок лісток на табе,**
**Ты, казача маладзенькі,**
**Няма праўданькі ў цябе.**

Даволі часта з дубамі магутнымі параўноваліся ў песнях кабзароў народныя ўкраінскія героі Сагайдачны, Залізняк, Кармелюк, Доўбуш і іншыя.

А ў рускіх народных песнях, калі гаворка заходзіць аб бацьку дзяўчыны, якая павінна вянчацца, то абавязкова з'яўляецца другі мастацкі вобраз-сімвал: магутнае дрэва з вялізным моцным голлем. Звычайна гэта дуб, (але сустракаюцца і іншыя дрэвы — елка, кіпарыс):

**Что у дуба, дуба зелена,**
**Много листа, много по-листу.**
**Нет серебряной вершиночки, —**
**Позолоченной маковочки,**
**Нету-нет у нашей Настеньки,**
**Нету-нет родима батюшки...**

і няма каму яе благаславіць. Асацыяцыі маглі падказаць народным песнярам вобраз бацькі — гаспадара, уладара, а магчыма нават, старэйшыны рода, які часцей за ўсё параўноўваўся з гордым, велічным асілкам — дубам.

У пералічаных творах дуб яшчэ адначасова сімвал чалавечай дабрыні, моцы, маладосці, кіпучага жыцця. Ад першабытнаабшчыннага «святога» татэма амаль што нічога не засталося. Хіба толькі «душа». Вельмі ж яна нагадвае ў народных песнях «сапраўдную» чалавечую «душу», якая блізка ўспрымае не толькі сваё, асабістае, але і чужое агульнае гора і бяду. «Душа», якую ўсё яшчэ бачаць сяляне ў дрэвах, ужо не тая «усемагутная», магічная, што магла кіраваць лёсам чалавека, а хутчэй традыцыйная, надуманая. Так ім перадавалі старэйшыя, так і яны пераказваюць малодшым, дадаючы ад сябе нейкія чараўнічыя, паўфантастычныя рысы, але не імкнучыся (бо магчыма не было патрэбы), даць пэўнае, абгрунтаванае тлумачэнне наконт тых ці іншых уласцівасцей дрэў.

У НАРОДНЫХ казках дуб, наадварот, па-ранейшаму захаваў некаторую «цудадзейную» сілу. Ён заўсёды выступае, як уладар лясоў, часам вельмі суровы, негаваркі, прымушае іншыя дрэвы безагаворачна выконваць свае загады. Магчыма, на такую «мадыфікацыю» традыцыйнага вобраза наклалі адбітак сацыяльныя падзеі, няроўнасць, існуючыя ў эксплуататарскім грамадстве. Казачнікі, якія бачылі несправядлівасць сярод людзей, перанеслі яе і на лес. Моцнае дрэва падпарадкоўвае сабе слабейшае, а вышэйшае не дае цягнуцца да сонца ніжэйшаму.

Часта казачным асілкам, якія абаранялі інтарэсы беднякоў, даводзілася выкарчоўваць і выкідаць цэлыя дубовыя гаі, што раскінуліся на іх шляху і прадстаўлялі сабою ворагаў земляробаў. Чаму менавіта дубы? Мабыць, таму, што такім чынам народныя казачнікі маглі яшчэ болей падкрэсліць фізічную сілу «шукальнікаў справядлівасці». Маўляў, якія не моцныя і магутныя гэтыя дрэвы, а сам чалавек за іх усё ж здаравейшы. Прыклад, прыведзены ў казцы «Каваль-багатыр», яскрава сведчыць пра гэта: «Ідзе ён (Каваль — А. Н.) да йдзе цёмным лесам і вайшоў у такую гушчэчу, што й свету божага не бачно: нельга йсці далей. Ухваціў ён сваю сякеру й давацъ паласкаць. Што махне, дык дзесяць дубоў і паляціць, бы чараціны».

Такім чынам, мы бачым, што ў фальклоры вобраз-сімвал дуба меў некалькі значэнняў: добры, лагодны бацька агромністай ляснoй сям'і, уладар пушчаў, надзелены неабмежаванай уладай, які часта выступае супраць сялян і, ў некаторых выпадках, былое свяшчэннае дрэва, якое захавала сваю магічную сілу.

**А. НЕНАДАВЕЦ,**
**асістэнт кафедры рускай літаратуры.**

(Заканчэнне ў наступным нумары газеты).

# Мікалай Уладзіміравіч ШАЛУХІН



29-га мая 1986 г. на 68-м годзе жыцця раптоўна памёр старэйшы выкладчык Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін Мікалай Уладзіміравіч Шалухін.

М. У. Шалухін нарадзіўся 22 сакавіка 1918 г. у г. Гомелі. Па заканчэнні 7 класаў вучыўся на Ялцінскім сельскагаспадарчым рабфаку, у Крымскім сельгасінстытуце, у Беларускім лесатэхнічным інстытуце, які ў 1941 годзе эвакуіраваўся ў г. Свярдлоўск, дзе праз год і закончыў лясны факультэт Уральскага лесатэхнічнага інстытута.

М. У. Шалухін — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам і медалямі.

У 1946 г. М. У. Шалухін быў дэмабілізаваны як спецыяліст народнай гаспадаркі. У 1947—1949 г.г. працаваў у сістэме Гомельскага трэста «Лесхімпрам» на пасадзе тэхнарука і інжынера па лесахіміі. З 1949 па 1952 г.г. быў аспірантам Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі. У 1952 г. М. У. Шалухін абараніў кандыдацкую дысертацыю і на працягу 10 гадоў працаваў старшым навуковым супрацоўнікам інстытута. У нашай ВНУ Мікалай Уладзіміравіч працаваў з 1963 года дацэнтам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. Ім апублікавана 35 навуковых работ, у тым ліку «Атлас па анатоміі раслін», якім і да цяперашняга часу карыстаюцца студэнты біялагічных факультэтаў педагагічных інстытутаў і універсітэтаў.

М. У. Шалухіна вызначалі шырокая эрудыцыя, жыццярадаснасць, працалюбства, добразычлівасць. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам сярод супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта.

Памяць пра Мікалая Уладзіміравіча Шалухіна назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

*КАНСУЛЬТАЦЫЯ ЮРЫСТА*

# РАБОТА ПА СУМЯШЧАЛЬНІЦТВУ

Сумяшчальніцтва — гэта выкананне, акрамя асноўнай, іншай рэгулярнай платнай работы за межамі рабочага часу першай. Сумяшчальніцтва дапускаецца толькі ў адной арганізацыі.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам прафесарска-выкладчыцкі састаў вышэйшых навучальных устаноў можа працаваць па сумяшчальніцтву ў лабараторыях прадпрыемстваў, у доследна-эксперыментальных, навуковых і іншых арганізацыях, якія выконваюць работы, звязаныя з развіццём радыёэлектронікі, прыборабудавання, хіміі і сельскай гаспадаркі. Сумяшчальніцтва дазваляецца навуковым работнікам навукова-даследчых устаноў і спецыялістам народнай гаспадаркі на педагагічнай рабоце ў ВНУ. Інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя маюць права выконваць па сумяшчальніцтву работу, звязаную з непасрэдным аказаннем паслуг насельніцтву на прадпрыемствах бытавога абслугоўвання. Дапускаецца работа па сумяшчальніцтву рабочых і малодшага абслугоўваючага персаналу, незалежна ад размера іх заработнай платы па асноўнай рабоце.

Для афармлення на работу па сумяшчальніцтву неабходны пісьмовы дазвол кіраўнікоў абодвух зацікаўленых прадпрыемстваў, узгоднены з прафсаюзнымі камітэтамі па асноўнай і сумяшчаемай работах. У дазволе з асноўнага месца работы павінна быць указана: у якой арганізацыі, на які тэрмін і ў які час сутак дазваляецца сумяшчальніцтва, а таксама ўмовы аплаты працы па асноўнаму месцу работы.

Прафесарска - выкладчыцкаму саставу аплата працы па сумяшчаемай пасадзе праводзіцца з разліку ўстаноўленага акладу па сумяшчаемай рабоце прапарцыянальна фактычнай нагрузцы, але не больш палавіны поўнага акладу па сумяшчаемай пасадзе. Для рабочых і малодшага абслугоўваючага персаналу аплата працы па другой рабоце праводзіцца з разліку акладу ў залежнасці ад яе аб'ёму і якасці. Аднак гэтая зарплата не павінна перавышаць аклад па асноўнай рабоце. Прэміі сумяшчальнікам налічваюцца ў агульным парадку.

Сумяшчальнікі маюць права на штогадовы водпуск як па асноўнай, так і па сумяшчаемай рабоце — той працягласці, якая ўстаноўлена для адпаведных пасад і прафесій. Водпуск па сумяшчаемай пасадзе прадстаўляецца адначасова з водпускам па асноўнай. Права на аплачваемы водпуск па сумяшчаемай рабоце маюць рабочыя, малодшы абслугоўваючы персанал, выкладчыкі тэхнікумаў, агульнаадукацыйных школ і медыцынскія работнікі. Прычым аплата па сумяшчаемай рабоце вызначаецца з сярэднемесячнага заработку за 12 месяцаў работы па гэтай пасадзе.

Звальненне з сумяшчаемай работы праводзіцца на падставах, прадугледжаных заканадаўствам, а таксама ў выпадках адмены дазволу на сумяшчальніцтва або прыёму на гэтую пасаду работніка, які не з'яўляецца сумяшчальнікам. Звальненне праводзіцца без згоды прафсаюзнага камітэта, папярэджання і выплаты выхадной дапамогі.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

СПОРТ

## ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ

● У Гомелі адбыўся заняльны турнір па футболу на першынство студэнцкага таварыства рэспублікі. На полі сустрэліся каманды ГДУ, Мазырскага педагагічнага, Магілёўскага тэхналагічнага і Гомельскага політэхнічнага інстытутаў. Нашы футбалісты ва ўсіх матчах атрымалі перамогу і выйшлі ў фінал першынства.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра батанікі і фізіялогіі раслін смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці дацэнта ШАЛУХІНА Мікалая Уладзіміравіча і выказваюць глыбокае спачуванне сям'і і родным памёршага.**

АЗ 43289

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52. Тыраж 2000 экз.